Польши от остального славянского мира, на отсутствие чувства «славянской взаимности» у подавляющего большинства польской интеллигенции. Интенсивное воздействие на Польшу германо-романской цивилизации, принятие поляками христианства в римско-католической традиции (в средние века непримиримо враждебной самой идее славянской самобытности) существенно деформировали национальные основы польской культуры уже на начальной стадии ее формирования; позднее «симпатические, славянские черты» польского характера были «значительно искажены иезуитским воспитанием» [2, с. 787]. В связи с изложенным большинство авторов «Гражданина», касавшихся «польского вопроса», отводило полякам довольно скромное место в славянской семье народов, считало необходимым и полезным длительное «славянизирующее» воздействие русской цивилизации на польскую культуру и ментальность.

*Литература*


1. А.Б. О мерах для распространения в России сведений о славянстве / А.Б. // Гражданин. – 1872. – № 4. – С. 132–136.
2. Белов, Е.[А.] Туман в истории и политике / Е.[А.] Белов // Гражданин. – 1873. – № 28. – С. 786–790.
3. Достоевский, Ф.М. Полн. собр. соч.: в 30 т. / Ф.М. Достоевский. – Л., 1972–1990.
4. И.С. [Киркор, А.-Г. К.] Из славянских земель (Корреспонденция «Гражданина») / И.С. [А.-Г. К. Киркор] // Гражданин. – 1874. – № 49. – С. 1242–1245.
5. [Мещерский, В.П.] Петербургское обозрение / [В.П. Мещерский, Ф.М. Достоевский] // Гражданин. – 1873. – № 10. – С. 283–285.
6. Филиппов, Т.[И.] Воспоминание о графе Александре Петровиче Толстом / Т.[И.] Филиппов // Гражданин. – 1874. – № 4. – С. 108–113.
7. Drouilly, J. Dostoievski et l'Europe en 1873 / J. Drouilly. – Ottawa, 1969. – 182 p.



**Таццяна Падаляк**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*


## ГІСТОРЫЯ СВЕДЧЫЦЬ: ГАЗЕТА ЖЫВЕ НЕ АДЗІН ДЗЕНЬ

У сувязі з імклівым развіццём інфармацыйных тэхналогій актыўна абмяркоўваецца пытанне замены папяровых газет інтэрнэт-аналагамі. Стала нават модным рабіць прагнозы: калі, праз колькі гадоў-дзесяцігоддзяў перастане існаваць "традыцыйная" газета. Тым не менш сур'ёзныя навукоўцы раяць не спяшацца хаваць газету.

Прэзідэнт факультэта журналістыкі МДУ імя М.В. Ламаносава, прафесар Я. Засурскі ў артыкуле «Чатыры стагоддзі газеты. Ці будзе пятае?» адзначае, што газета – не толькі папера, на якой яна надрукавана, гэта больш высокі ўзровень аналізу, шырыня і грунтоўнасць ахопу падзей, так неабходная грамадзяніну XXI стагоддзя. Аўтарытэтны даследчык згадвае апублікаваны ў газеце «Нью-Ёрк Таймс» (24.08.2009) артыкул «У абарону газеты» Гаральда Эванса, які працяглы час працаваў рэдактарам нядзельнай лонданскай газеты «Сандзі Таймс». У аснове артыкула – рэцэнзія на выдадзеную ў 2009 г. кнігу Алекса Джонса «Тэорыя навіны. Будучыня навінаў, якія сілкуюць дэмакратыю». Эванс салідарызуецца з Джонсам у крытыцы інфармацыйнай палітыкі тэлебачання і інтэрнэту, якая «ў аснове сваёй другасная», а друкаваную газету лічыць жыццёвай сілай «з трапяткім сэрцам абшчыны» і мяркуе, што 85 % заснаваных на фактах навінаў у сеціве і на тэлебачанні бяруцца з газет. Ён называе тэлебачанне «другасным медыя» і мяркуе, што інтэрнэт-сайты «не стануць падтрымліваць замежныя карпункты, штаты карэспандэнтаў па навуцы і культуры». Эванс збянтэжаны парадамі футуролага, які рэкамендаваў дэканам факультэтаў журналістыкі вучыць наступнае пакаленне «пісаць артыкулы не даўжэй пяцідзесяці слоў». З гэтага вынікае рытарычнае пытанне: ці можам мы застацца інфармаванымі, калі навіны будуць абмежаваныя памерамі экрана мабільнага тэлефона? [1, с. 7–8]. Надзеі ўскладаюцца на тое, што якасныя газеты будуць развіваць паралельныя з папяровымі анлайнавыя выданні, каб захаваць якасную журналістыку. Я. Засурскі падкрэслівае: «...калі пішуць, што, магчыма, папяровая газета і памрэ, але застанецца электронная версія, якая будзе выконваць яе функцыі, з гэтым можна пагадзіцца, а можна і не пагаджацца, таму што **такі носьбіт, як папера, аказваецца больш даўгавечным і трывалым, чым хуткацечныя радкі інтэрнэту і SMS-мабільных тэлефонаў»** (выдзелена мной. – Т. П.) [Тамсама, с. 6].

Цалкам пагаджаемся з даследчыкам, паколькі сёння ў сеціве інфармацыя можа быць, а назаўтра яна можа знікнуць назаўсёды – і беззваротна. Так, у інтэрнэт-версіі газеты вельмі лёгка (і сапраўды беззваротна) выпраўляюцца памылкі, «ляпы», недакладнасці. Напрыклад, вядомая кніга «Жывая вера. <u>Ветка</u>» ў газеце «Звязда» за 27 лютага 2013 г. названа... «Жывая вера. <u>Галінка</u>». У інтэрнэт-версіі памылка выпраўлена, тады як на паперы, у падшыўках яна засталася – назаўсёды. Аналагічныя прыкла-

ды сустракающца і ў іншых выданнях. У газеце «Чырвоная змена» за 30 студзеня 1999 г. чытаем: «Дж. Пучыні. «Сум» (опера называецца «Тоска»). Газета «Белорусская нива» 18 красавіка 2002 г., публікуючы ў рубрыцы «Беларускі ручнік» верш Якуба Коласа, паставіла партрэт… Янкі Купалы. Газета «Советская Белоруссия» 15 жніўня 2002 г. у публікацыі да 85-годдзя Янкі Брыля назвала класіка народным паэтам Беларусі (у 1981 г. яму прысвоена званне народнага пісьменніка)… Архівіраванне – надзвычай важны для гісторыі паказчык. Калі гаварыць пра прадукт журналістыкі ў папяровым варыянце, дык ён сам выступае ў якасці і сродку, і спосабу архівіравання, які не патрабуе ніякіх (альбо вымагае мінімальных) дадатковых выдаткаў, што павышае адказнасць аўтараў, журналістаў і выдаўцоў за напісанае-апублікаванае.

Папяровы носьбіт – больш надзейны фіксатар «гісторыі сучаснасці». У якасці важкай аргументацыі можа выступаць гісторыя найстарэйшай беларускай газеты «Звязда». Аўтар даклада працавала ў газеце на працягу 20 гадоў (1992–2012) і мела магчымасць назіраць вяртанне жывой гісторыі журналістыкі. У 2005 г. чытач з вёскі Ігрушка Крупскага раёна Барыс Красько даслаў у рэдакцыю нумар газеты за 29 чэрвеня 1920 г. «85-гадовы нумар, добра-такі патрапаны, але ўсё ж жывы. І на яго старонках можна прачытаць пра захопніцкія планы барона Урангеля, пра тое, як жывецца няшчасным заходнім беларусам за польскімі панамі… Нашаму выданню было тады няпоўныя тры гады… Нібы кавалачак жывой гісторыі трапіў у рукі. Тым больш каштоўны гэты экземпляр, што нават у Нацыянальнай бібліятэцы захаваліся не ўсе нумары канца 1920-х гг, не кажучы ўжо пра пачатак» (Звязда. 2005, 10 чэрвеня). Асобная размова пра беларускую журналістыку часоў Вялікай Айчыннай вайны. На акупаванай тэрыторыі Беларусі выходзіла больш за 170 падпольных газет, несумненным лідарам сярод якіх была «Звязда». Прайшло амаль сем дзесяцігоддзяў пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а нумары падпольнай «Звязды» выяўляюцца-знаходзяцца і працягваюць вяртацца з ваеннага ліхалецця ў сучаснасць.

Два экзэмпляры першага нумара падпольнай «Звязды» ў 2001 г. перадаў у рэдакцыю мінчанін Аляксандр Краўцоў. «Даволі незвычайная папера, на якой аддрукавана газета. Крыху выцвілы тэкст. У некаторых месцах папера пачала распадацца: захоўвалася ж газета не ў архіве!.. Просім Аляксандра Ціханавіча расказаць гісторыю гэтых двух экзэмпляраў газеты. Але ён разводзіць рукамі: не ведаю. У пачатку года памерла яго цёця, Кацярына Рыгораўна

Касьянава (1919 года нараджэння)… Пасля жалобнага рытуалу Краўцоў пачаў перабіраць цётчын небагаты скарб, праглядаць старыя газеты, часопісы, песеннікі, якімі была забіта тумбачка. І раптам убачыў «Звязду». Першая думка: можа, ксеракопію хто зрабіў? Але пытанне адразу было знята: газеты ў тумбачцы захоўваліся на працягу многіх гадоў, тады пра ксеракопіі ніхто і ўяўлення не меў» [2, с. 3]. Як падпольная «Звязда» трапіла да Кацярыны Касьянавай, якая ў час вайны жыла ў вёсцы Свіслач Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці, невядома. Магчыма, хтосьці з вяскоўцаў падтрымліваў сувязь з мінскім падполлем. Што чакала тых, у каго немцы знаходзілі падпольную газету, добра вядома: смяротны прысуд. Тым не менш жанчына захоўвала «Звязду» ў час фашысцкай акупацыі, а потым і ўсё жыццё. І захавала – для нашчадкаў.

Расказваючы гэтую гісторыю, журналісты звярнуліся да чытачоў: магчыма, хто-небудзь ведае, якім чынам трапіла ў вёску падпольная газета? Карэнны жыхар Свіслачы Георгій Забаўскі паведаміў, што «ў жніўні 1942 г. непадалёк ад вёскі – там, дзе за полем пачынаецца лес, месца гэтае вяскоўцы называюць Намертлі, – да вялікага дуба хтосьці акуратна прымацаваў падпольную «Звязду». Вестка пра сваю газету імгненна абляцела наваколле. Людзі шэптам расказвалі, перадавалі адзін аднаму вычытаную ў газеце інфармацыю. Асцярожна, каб не ўбачылі чужыя вочы, хадзілі да дуба чытаць газету… Нягледзячы на тое, што ў Свіслачы стаяў нямецкі гарнізон, вяскоўцы не скарыліся, патрыётаў было многа. Па вёсцы хадзілі лістоўкі, я і сам хаваў іх пад вазонамі» [3, с. 4]. Пра значную ролю, якую адыгрывала падпольная газета ў акупаванай Беларусі, успамінаў пісьменнік Валянцін Тарас. Ён працаваў у штаце «Звязды» адразу пасля заканчэння БДУ (1955-1962), а ў Вялікую Айчынную вайну 13-гадовым хлапчуком трапіў у партызанскі атрад і таксама меў дачыненне да газеты: «Я ведаў Надзею Міхайлаўну Баўбель, якая была звязана з падполлем. У яе быў адзін асобнік першага нумара падпольнай «Звязды»… Яна даручыла мне з газетай хадзіць па хатах, да людзей, якіх добра ведала, якім давярала, – каб чыталі газету. За гэта ледзь не паплаціліся жыццём... Слова і жыццё былі непадзельныя, бо слова вынікала з жыцця, з супраціву гітлераўскім захопнікам» (Звязда. 2005, 11 лютага.).

У 2008 г. вярнуўся яшчэ адзін экзэмпляр падпольнай «Звязды» – каштоўны гістарычны падарунак зрабіла рэдакцыі гімназія № 25 г. Мінска імя Рымы Шаршнёвай. Сімвалічна: вучаніца 25-й даваеннай школы, мужная партызанка Рыма Шаршнёва, якая

распаўсюджвала «Звязду» ў гады Вялікай Айчыннай вайны і загінула на Любаншчыне, данесла падпольную газету і ў ХХІ стагоддзе, дзякуючы патрыятычна-пошукавай рабоце цяперашніх вучняў 25-й гімназіі: яны былі актыўнымі ўдзельнікамі сумеснага праекта газеты і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны «Радок «Звязды» ў гісторыі краіны», прымеркаванага да 90-годдзя выдання. У ходзе пошукавай работы навучэнцы знайшлі новыя факты біяграфіі газеты, адшукалі нашчадкаў тых падпольшчыкаў і партызанаў, якія ўдзельнічалі ў выпуску і распаўсюджванні газеты ў гады вайны [6, с. 2]. Малодшая сястра Рымы Шаршнёвай перадала гімназіі шэраг фотаздымкаў і дакументаў, у тым ліку падпольную «Звязду». У гімназічным музеі захоўваецца ксеракопія гэтага ўнікальнага выдання, а арыгінал перададзены рэдакцыі [4, с. 1,7]. Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны не перастае быць сучаснасцю – мабыць, акурат у гэтым сэнс пераемнасці пакаленняў, выхаванне патрыятызму ў нашай краіне.

І яшчэ адна досыць паказальная «гісторыя з канверта»: былы партызан і франтавік, узнагароджаны ордэнам Славы ІІІ ступені, двума медалямі «За адвагу», іншымі баявымі ўзнагародамі, Аляксей Пухавой з г. Беразіно Мінскай вобласці даслаў у рэдакцыю ўнікальны дакумент – 12-ы нумар сатырычнага агітплаката «Раздавим фашистскую гадину», які выдавала «Звязда» з ліпеня 1941 г. Ён захоўваў агітплакат усё жыццё: «Гэты і іншыя нумары лістоўкі-агітплаката ўзнімалі настрой насельніцтва, скіроўвалі патрыётаў на барацьбу з нямецка-фашысцкімі акупантамі. Невыпадкова ў Беларусі ўзняўся масавы партызанскі рух. Наша сям'я, усе пяць братоў, удзельнічалі ў барацьбе з нямецкімі акупантамі» [5, с. 6]. У вайну Аляксей Пухавой распаўсюджваў лістоўкі, плакаты, падпольныя газеты. Як удалося захаваць агітплакат з ліпеня 1941 г.? Усе дакументы і паперы, якія лічыў важнымі, закапаў у хляве... Варта згадаць: спачатку агітплакат выходзіў на рускай мове, з сакавіка 1942-га – на беларускай, менавіта тады і ператварыўся ў газету-плакат; са жніўня 1945 г. выходзіць як сатырычна-гумарыстычны часопіс «Вожык».

Нумар «Звязды» за 3 ліпеня 1945 г. быў каляровым – упершыню ў гісторыі беларускай журналістыкі. І гэты нумар таксама захаваўся ў многіх сем'ях як каштоўная рэліквія. Напрыклад, знакаміты аўтар буквароў, заслужаны работнік культуры Беларусі Анатоль Клышка ў адной з публікацый прызнаецца: «Памятаю і цяпер гэты святочны, маляўнічы нумар за 3 ліпеня1945 года. Дзіцячае вока так прагла колераў. А тады ўсюды пасляваенны чорна-белы

друк, нават у буквары. Я з трымценнем у сэрцы трымаў гэты нумар «Звязды» ў руках, разглядваў, чытаў. А пасля прымацаваў на сцяне, дзе ў сялянскай хаце тады звычайна вешалі нешматлікія сямейныя фатаграфіі. І кожны, хто заходзіў у нашу хату, тут жа ўпіваўся вачыма ў гэтае газетнае свята» [9, с. 5].

Як стала магчымым ва ўмовах 1945 г. выпусціць каляровую газету? Журналіст Янка Казлоў, які пачаў працаваць у «Звяздзе» адразу пасля вызвалення Беларусі, у 1944-м, паведаміў: «У Гродне была літаграфія. Самалётам завезлі паперу, аддрукавалі малюнак, а потым ужо ў Мінску друкавалі тэкст… Але хтосьці з наборшчыкаў убачыў, што на малюнку рукі Сталіна надта чырвоныя – нібыта ў крыві: у некаторыя водціскі шмат чырвонай фарбы трапіла. Дык мы, журналісты, пераглядалі ў друкарні кожны нумар «Звязды» – бракавалі, адкідалі экзэмпляры газеты, дзе ў Сталіна чырвоныя рукі» [6, с. 37].

Гэты, нумар газеты за 3 ліпеня 1945 г. захаваў і мастак Іосіф Белановіч. Ён прайшоў усю вайну, быў дэмабілізаваны ў 1946-м: год пасля Перамогі знаходзіўся ў акупацыйных войсках у Германіі. Хтосьці з родных менавіта туды даслаў яму каляровы нумар «Звязды». Вяртаючыся ў Беларусь, мастак прывёз газету з сабой і захоўваў усё жыццё [7, с. 4]. Да 65-годдзя вызвалення Беларусі ў сталічнай бібліятэцы імя Льва Талстога працавала выстаўка аднаго нумара «Звязды». Дарэчы, 3 ліпеня 1945 г. апублікаваны выдатны артыкул Ільі Эрэнбурга «Верная сярод верных», дзе публіцыст дае аб’ектыўную характарыстыку рэспублікі: «Да вайны свет дрэнна ведаў Беларусь. Я памятаю, як французскія газетчыкі блыталі словы «беларусы» і «белыя рускія». У той жа Францыі праз некалькі гадоў падпольныя газеты пісалі: «Мы павінны натхняцца геройствам беларусаў» — свет, нарэшце, даведаўся, што такое Беларусь! <...> Верная сярод верных, будзь благаславенна, Беларусь! На тваім целе многа-многа ран. На тваім чале больш за ўсё лаўраў. Ніколі Радзіма не забудзе тваіх партызан, якія ператварылі зялёныя пушчы ў непрыступныя савецкія краі. <...> Народ, які можа так ваяваць, — вялікі народ. Беларусы залечаць раны роднай зямлі. Яны адбудуюць Мінск, Гомель, Магілёў, усе гарады, спаленыя ворагам. Яны перамаглі захопнікаў, яны перамаглі гора. З імі цені герояў. З імі памяць аб гадах выпрабавання. З імі слава партызанскіх подзвігаў… Няхай жа ўвойдзе перамога ў кожны дом, у кожную хату, сядзе за стол, надрэжа хлеб і няхай жа адчуе і стары, і ўдава, і дзіця на губах смак перамогі, смак шчасця!»

Распаўсюджанае меркаванне: газета жыве адзін дзень. Аднак гэта прыгожы афарызм, не болей. Падшыўкі газет акунаюць ў глы-

біню гісторыі, даюць адчуванне паху мінулага: яго гукаў, галасоў, рытмаў, мелодыкі. Гэта дакладны дакумент эпохі, люстраны адбітак жыцця.

*Літаратура*


1. Засурский, Я. Н. Четыре века газеты. Будет ли пятый? / Я.Н. Засурский // Вестник Моск. ун-та. Сер. 10. Журналистика. – 2010. – № 2.
2. Падаляк, Т. Падпольная «Звязда» / Т. Падаляк // Звязда. – 2001. – 8 мая.
3. Падаляк, Т. «Звязду» прымацавалі да дуба, каб можна было прачытаць… / Т. Падаляк // Звязда. – 2001. – 20 чэрвеня.
4. Падаляк, Т. З чаго пачынаецца Радзіма... / Т. Падаляк // Звязда. – 2008. – 1 лютага.
5. Падаляк, Т. Агітплакат, выпушчаны «Звяздой», наш чытач Аляксей Пухавой захоўвае ўсё жыццё / Т. Падаляк // Звязда. – 2007. – 9 жніўня.
6. Падаляк, Т. «Белыя росы» Янкі Казлова / Т. Падаляк // Журналист. – 2009. – № 1–2.
7. Падаляк, Т. Гісторыя аднаго нумара «Звязды» / Т. Падаляк // Звязда. – 2008. – 9 жніўня.
8. Пахвалёная, А. Родная газета дапамагае і ў працы, і ў жыцці… / А. Пахвалёная // Звязда. – 2007. – 13 студзеня.
9. Клышка, А. Нумар «Звязды» за 3 ліпеня 1945 года я прымацаваў на сцяне, дзе ў сялянскай хаце звычайна вешалі сямейныя фатаграфіі... / А. Клышка // Звязда. – 2007. – 9 жніўня.



**Анна Петроченко**

*Белорусский государственный университет*


# МЕДИАЦЕНТРЫ ПРИ РЕГИОНАЛЬНЫХ ЦЕНТРАХ ТРАНСФЕРА ТЕХНОЛОГИЙ В ПРОЦЕССЕ РЕАЛИЗАЦИИ ИННОВАЦИОННОЙ СТРАТЕГИИ БЕЛАРУСИ

Региональные медиа являются особым сегментом в национальной системе СМИ, создающие реальную детальную информационную картину в конкретном экономико-административном регионе. Современные региональные СМИ Беларуси в рамках инновационной деятельности (далее – ИД) являются площадкой, способной раскрыть для широкой общественности суть научно-производственного процесса в условиях становления и укрепления экономики знаний в Беларуси. Инновационная политика государства становится активным источником информации в белорусских региональных